*А. Г. КАХАНОЎСКІ*

# МІГРАЦЫЙНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ НА МЯЖЫ XIX—XX стст.

Рынак працы, яго структура і асаблівасці фарміравання з’яўляюцца дастаткова выразным паказчыкам сацыяльнага становішча насельніцтва, яго ўзнікненне звязана са станаўленнем рыначных адносін і развіццём капіталізму. У яго сферу ўваходзіць фарміраванне попыту і прапаноў на рабочую сілу. Мабільнасць працоўных рэсурсаў — адзін з важнейшых параметраў, які ў дадзеным выпадку характарызаваў стан капіталістычнай трансфармацыі беларускага грамадства.

Нельга пагадзіцца з аўтарам раздзела «Міграцыі» Я. Насыткам калектыўнай працы «Гістарыяграфія гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст.: праблемы, здабыткі, перспектывы» аб тым, што «праблема міграцый беларускага насельніцтва ў дэмаграфічным сэнсе ў Расійскай імперыі ў гістарычнай літаратуры вывучана даволі поўна і аб’ектыўна» [3, с. 54]. Варта толькі згадаць, што нават інфармацыйныя магчымасці апублікаваных матэрыялаў перапісу насельніцтва 1897 г. у гэтым напрамку даследчыкамі да канца не вычарпаны. У айчыннай гістарыяграфіі сфарміравана агульнае ўяўленне аб міграцыйных патоках насельніцтва, найперш сельскіх жыхароў, з тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. (працы П. Верашчагіна [1], З. Сямейных [13], В. Панюціча [4], У. Філякова [14] і інш.). Аднак ішоў і зваротны працэс. У кожнай з беларускіх губерняў пражывала адчувальная колькасць асоб, якіх у статыстычных крыніцах таго часу называлі немясцовымі ўраджэнцамі, г. зн. выхадцамі з іншых рэгіёнаў, суседніх, у тым ліку і беларускіх, губерняў. Колькі іх было, адкуль яны паходзілі — гэтыя пытанні засталіся па-за ўвагай беларускіх гісторыкаў.

**Міграцыі насельніцтва на тэрыторыю Беларусі.** Сацыяльную дынаміку беларускага грамадства ў другой палове XIX — пачатку XX ст. у вялікай ступені характарызавала разгортванне працэсаў тэрытарыяльнай

---

**Каханоўскі Аляксандр Генадзьевіч** — загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

---

мабільнасці насельніцтва, у тым ліку іміграцыйныя патокі на тэрыторыю Беларусі ўраджэнцаў іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі і замежных дзяржаў, што падкрэслівала іх эканамічныя сувязі, тэндэнцыі фарміравання рынку працы, магчымасці адаптацыі перасяленцаў. Дадзеныя перапісу насельніцтва 1897 г. дазваляюць характарызаваць накірункі міграцыйных патокаў. На мяжы XIX—XX стст. у беларускіх губернях было зафіксавана 501 299 немясцовых ураджэнцаў, якія складалі 5,9 % ад агульнай колькасці насельніцтва [падлічана па: 7, 9—12, табл. 7]. Іх удзельная вага ў гарадах была значна вышэй — 21,6 %. Большасць немясцовых ураджэнцаў (88,5 %) былі выхадцамі з еўрапейскай часткі Расійскай імперыі. У сярэднім па кожнай з беларускіх губерняў налічвалася 34,8 % ураджэнцаў з іншых беларускіх губерняў. Такім чынам, асноўная частка тых, хто перасяляўся на тэрыторыю беларускіх губерняў, паходзілі з іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі. Акрамя таго, тут былі зарэгістраваны 7872 выхадцы з замежных краін. Амаль 62 % іх пражывала ў сельскай мясцовасці. Такая ж удзельная вага немясцовых ураджэнцаў, якія знайшлі сабе прымяненне ў вёсцы, характэрна для тых, хто перасяляўся з адной беларускай губерні ў другую. Агулам сярод усіх немясцовых ураджэнцаў доля сельскіх жыхароў складала 55,1 %.

У Мінскай губерні сярод насельніцтва налічвалася 113 306 (каля 5,3 % ад агульнай колькасці насельніцтва губерні) жыхароў, якія перасяліліся з аднаго павета ў другі ў межах роднай губерні, 106 332 (каля 4,9 %) перасяленцаў з іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі і замежжа; сумарна 10,2 % насельніцтва Мінскай губерні было ўключана ў працэсы прасторавага перамяшчэння [11, табл. 7]. Значна большую за сярэднюю па губерні мабільнасць праяўлялі жыхары гарадоў, у іх ліку было 36 % тых, хто перасяліўся з іншых паветаў губерні ці іншых рэгіёнаў. Удзельная вага апошніх склала 18,1 %. Сярод немясцовых ураджэнцаў Мінскай губерні налічвалася 98 330 (92,5 % ад агульнай колькасці немясцовых ураджэнцаў) выхадцаў з іншых губерняў еўрапейскай часткі Расійскай імперыі (без прывісленскіх), у тым ліку 57 798 (54,4 %) ураджэнцаў з іншых беларускіх губерняў. У структуры насельніцтва Мінскай губерні больш за іншых налічвалася мігрантаў з Віленскай (22 468 чалавек), Магілёўскай (19 335 чалавек), Гродзенскай (11 676 чалавек) губерняў. Параўнальна высокай была прысутнасць выхадцаў з Валынскай (5706 чалавек), Чарнігаўскай (4708 чалавек), Ковенскай (4096 чалавек), Кіеўскай (2388 чалавек), Курляндскай (1432 чалавекі), Смаленскай (1364 чалавекі), Маскоўскай (1185 чалавек), Пскоўскай (2005 чалавек), Саратаўскай (1229 чалавек) і Сімбірскай (1097 чалавек) губерняў. Сярод ураджэнцаў апошніх

трох губерняў асноўную частку складалі мужчыны, пражывалі яны пераважна ў Мінску і Бабруйску, хутчэй за ўсё гэта былі служачыя, найперш вайскоўцы. Дарэчы, выхадцы з вялікарускіх губерняў пасяляліся, як правіла, у гарадах, з астатніх рэгіёнаў Расійскай імперыі — у сельскай мясцовасці. У прыватнасці, сярод больш чым паўтары тысячы рабочых Пінскіх рамонтных майстэрняў Палескіх чыгунак працавалі дзясяткі выхадцаў з Масквы, Растова-на-Доне, Варонежа, Уладзіміра, Бранска, Калугі і інш. Каля 30 % рабочых Галоўных майстэрняў Лібава-Роменскай чыгункі ў Гомелі з'яўляліся ўраджэнцамі Цэнтральнай Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі і Польшчы [14, с. 21]. На Віцебскай ільнопрадзільнай фабрыцы «Дзвіна» ўсе кваліфікаваныя рабочыя былі выхадцамі з Яраслаўля, Ніжняга Ноўгарада, Уладзіміра, Мітавы [14, с. 21].

Сярод жыхароў Мінскай губерні налічвалася 2430 (2,3 % ад агульнай колькасці немясцовых ураджэнцаў) выхадцаў з замежных краін. Асноўная колькасць іх (76 %) пражывала ў сельскай мясцовасці. Ураджэнцы іншых краін паходзілі пераважна з Прусіі (958 чалавек) і Аўстра-Венгрыі (693 чалавекі). Дарэчы, на працягу першых гадоў пасля адмены прыгоннага права ў маёнткі Мінскай губерні было нанята 1070 замежных рабочых, з іх 833 мелі сем'і. Яны прыбывалі пераважна з Усходняй Прусіі, Галіцыі, Сілезіі, Чэхіі і інш. [5, с. 49—50]. Памешчыкі прыцягвалі таксама да працы па найме батракоў з Латвіі, Украіны і інш. У некаторых выпадках колькасць такіх рабочых дасягала значнай лічбы. У буйным зямельным уладанні Рудабелка Бабруйскага павета на правах арандатараў пасялілася каля 500 беззямельных сялян-латышоў, якія ўтварылі асобнае сельскае таварыства [5, с. 50].

У Магілёўскай губерні налічвалася 78 014 чалавек (4,6 % ад агульнай колькасці насельніцтва), якія перасяліліся з аднаго павета ў другі ў межах роднай губерні, і 71 714 (4,3 %) немясцовых ураджэнцаў, сумарна — 8,9 % [12, табл. 7]. У ліку апошніх пераважную частку складалі выхадцы з еўрапейскай часткі Расійскай імперыі — 68 657 чалавек (95,7 % ад агульнай колькасці немясцовых ураджэнцаў), у тым ліку з беларускіх губерняў — 31768 чалавек (44,3 %). Гарады традыцыйна вызначаліся значна больш высокай ступенню тэрытарыяльнай мабільнасці сваіх жыхароў. У складзе іх насельніцтва налічвалася 24 310 немясцовых ураджэнцаў (33,9 % ад агульнай іх лічбы па губерні; 16,5 % ад колькасці гарадскіх жыхароў). Разам з 22 101 гараджанінам, хто змяніў месца жыхарства ў межах роднай губерні, удзельная вага выхадцаў з іншых паветаў і рэгіёнаў у структуры гарадскога насельніцтва складала 31,5 % [11, с. 2, табл. 7]. У Магілёўскай губерні налічвалася параўнальна няшмат выхадцаў з

іншых дзяржаў — 588 чалавек (0,8 % ад агульнай колькасці немясцовых ураджэнцаў). Найбольшую колькасць сярод іх складалі выхадцы з Прусіі (301 чалавек) і Аўстра-Венгрыі (70 чалавек). Каля 60 % ураджэнцаў іншых краін пражывала ў Магілёўскай губерні ў сельскай мясцовасці. Сярод насельніцтва Магілёўскай губерні больш за іншых немясцовых ураджэнцаў налічвалася выхадцаў з Мінскай (16 204 чалавекі), Віцебскай (10 358 чалавек), Чарнігаўскай (8604 чалавекі), Ковенскай (4373 чалавекі), Віленскай (4313 чалавек), Смаленскай (4309 чалавек) губерняў. Параўнальна нязначным было прадстаўніцтва ў Магілёўскай губерні выхадцаў з Гродзенскай губерні (893 чалавекі).

У Віленскай губерні немясцовыя ўраджэнцы складалі 6,1 % ад агульнай колькасці насельніцтва (96 465 чалавек) [7, табл. 7]. Разам з жыхарамі, што змянілі месца жыхарства ў межах роднай губерні (85 758 чалавек), іх удзельная вага дасягала 11,5 %. Асноўную масу немясцовых ураджэнцаў Віленскай губерні склалі выхадцы з губерняў еўрапейскай часткі Расійскай імперыі — 83 959 чалавек (87 % ад агульнай колькасці немясцовых ураджэнцаў). У іх ліку 31 812 выхадцаў з іншых беларускіх губерняў (33 %). Сярод замежных ураджэнцаў Віленскай губерні (1668 чалавек) традыцыйна пераважалі выхадцы з Прусіі і іншых германскіх зямель (1106 чалавек) і Аўстра-Венгрыі (241 чалавек). Большая частка іх (53,8 %) пражывала ў гарадах, што не было характэрным для астатніх беларускіх губерняў, і перш за ўсё, у Вільні і Віленскім павеце (70,2 %). Каля 7,3 % (7067 чалавек) немясцовых ураджэнцаў Віленскай губерні паходзіла з прывісленскіх губерняў (напрыклад, Сувалкскай губерні), большая частка з іх была сканцэнтравана ў Трокскім павеце і ў Вільні. Самую вялікую колькасць выхадцаў з іншых рэгіёнаў склалі ўраджэнцы суседніх Ковенскай (19 222 чалавекі), Мінскай (15 126 чалавек), Гродзенскай (7817 чалавек), Віцебскай (7545 чалавек) губерняў. Дарэчы, значная частка іх пражывала ў Вільні, і ў асноўным — мужчыны. Гэта хутчэй за ўсё былі веннаслужачыя.

Асноўная частка (52,5 %) немясцовых ураджэнцаў Віленскай губерні была сканцэнтравана ў гарадах. Тут яны складалі 25,6 % агульнай колькасці жыхароў, а ў сельскай мясцовасці — толькі 3,3 %. Ураджэнцы суседніх губерняў часцей за ўсё сяліліся ў памежных паветах, і галоўным чынам гэта датычылася жанчын, якія ў канцы XIX ст. сталі выходзіць замуж не толькі ў роднай вёсцы ці самай блізкай акрузе, але і ў недалёкія населеныя пункты суседняга павета.

Калі звузіць разгляд па Віленскай губерні да 4 беларускіх паветаў, то ў іх межах немясцовыя ўраджэнцы складалі 3,4 % ад колькасці насель-

ніцтва. Гэты паказчык адчувальна меншы за сярэдні па губерні. У той жа час удзельная вага выхадцаў з беларускіх губерняў сярод немясцовых ураджэнцаў была амаль удвая вышэй (63,7 %) на тэрыторыі беларускіх паветаў, чым па губерні ў цэлым. Дадзеныя паказчыкі сведчаць аб меншай іх уключанасці ў міграцыйныя працэсы на агульнагубернскім узроўні. Аднак трэба ўлічваць, што амаль палова (45,4 %) немясцовых ураджэнцаў, зарэгістраваных у Віленскай губерні, прыходзілася на г. Вільню. Акрамя таго, вылучэнне ў айчыннай гістарыяграфіі 35 паветаў, якія ўпісваюцца ў сучасныя межы Беларусі, у якасці тэрытарыяльнай прасторы разгляду мае для другой паловы XIX — пачатку XX ст. у пэўнай ступені штучны характар. Сацыяльна-эканамічныя, палітычныя, этнакультурныя і іншыя працэсы таго часу, якія непасрэдна вызначалі развіццё Беларусі, мелі больш шырокую тэрытарыяльную (геаграфічную) прывязку. Для іх паўнацэннага асэнсавання трэба не абмінаць магчымасці даследчыцкага пошуку ў межах 5 беларускіх губерняў, а таксама праводзіць параўнальны аналіз у кантэксце тых працэсаў, што адбываліся ў суседніх губернях, а таксама ў межах еўрапейскай часткі Расійскай імперыі.

У Віцебскай губерні немясцовых ураджэнцаў налічвалася 113 621 чалавек, іх удзельная вага ў агульнай колькасці насельніцтва склала 7,6 %, разам з ураджэнцамі іншых паветаў (78 694 чалавекі) губерні — 12,9 % [9, табл. 7]. Немясцовыя ўраджэнцы прыкладна пароўну размяркоўваліся па гарадах і сельскай мясцовасці губерні. У той жа час удзельная вага выхадцаў з іншых рэгіёнаў у гарадах складала 25,5 %, а ў сельскай мясцовасці — 4,6 %. Адносна нязначная іх частка (26,4 %) паходзіла з іншых беларускіх губерняў. Дарэчы, у гарадах гэты паказчык быў некалькі вышэй — 30,7 %. Найбольшая колькасць немясцовых ураджэнцаў Віцебскай губерні паходзіла з суседніх Курляндскай (17 519 чалавек), Ліфляндскай (17 285 чалавек), Ковенскай (14 698 чалавек), Магілёўскай (13 483 чалавекі), Віленскай (11 895 чалавек), Пскоўскай (7040 чалавек) губерняў. Накірунак міграцыйных патокаў у значнай ступені характарызаваў устойлівыя эканамічныя сувязі. Параўнальна няшмат у Віцебскай губерні налічвалася выхадцаў з іншых дзяржаў — 243 чалавекі, больш паловы якіх паходзіла з Германіі.

У Гродзенскай губерні на мяжы XIX—XX стст. налічвалася 113 167 немясцовых ураджэнцаў, якія складалі каля 7,1 % ад агульнай колькасці насельніцтва [10, табл. 7]. Акрамя таго, перапісам было зафіксавана 87 174 мігранты, якія перасяліліся з аднаго павета ў другі ў межах губерні. Разам удзельная вага тых, хто перасяліўся ў межах губерні і з іншых

рэгіёнаў, дасягала 12,5 %. Сярод гарадскога насельніцтва Гродзенскай губерні налічвалася 21,4 % немясцовых ураджэнцаў. Доля выхадцаў з еўрапейскай часткі Расійскай імперыі сярод немясцовых перасяленцаў складала 71,9 %, у тым ліку з іншых беларускіх губерняў — 20,3 %. Колькаснае значэнне апошняга паказчыка для Гродзенскай губерні было самае нізкае ў параўнанні з іншымі беларускімі губернямі. Найбольшая колькасць была зарэгістравана ўраджэнцаў Мінскай (10 065 чалавек), Віленскай (8745 чалавек), Валынскай (6647 чалавек) губерняў. У Гродзенскай губерні налічвалася 2943 выхадцы з другіх дзяржаў, асноўная частка з якіх паходзіла з Прусіі і іншых германскіх зямель — 2063 чалавекі (70,1 %). Адносна шмат пражывала ў Гродзенскай губерні выхадцаў з Прывісленскіх губерняў — 27 195 чалавек (24,0 % ад агульнай колькасці немясцовых ураджэнцаў), перш за ўсё з Ломжынскай, Сядлецкай і Варшаўскай губерняў.

**Памеры міграцый насельніцтва ўнутры беларускіх губерняў.** Пэўнае ўяўленне аб інтэнсіўнасці сацыяльна-эканамічных сувязей паміж беларускімі губернямі даюць даныя перапісу насельніцтва 1897 г., дзе прадстаўлены колькасныя паказчыкі міграцыйных патокаў унутры іх, гэта значыць перасяленняў з адной беларускай губерні ў іншую і ўнутры кожнай з іх — з павета ў павет. Абсалютна зразумелым з'яўляецца, што найбольшая колькасць перасяленняў прыпадала на міграцыі ўнутры губерняў, а таксама паміж сумежнымі губернямі. Прычым абмен міграцыйнымі патокамі быў пераважна ўзаемным. З Мінскай губерні выхадцы пасяляліся ў суседніх Магілёўскай і Віленскай губернях і, наадварот, з Магілёўскай і Віленскай, перш за ўсё — у Мінскай. Усяго, паводле даных перапісу насельніцтва 1897 г., налічвалася 617 413 ураджэнцаў беларускіх губерняў (7,3 % ад агульнай колькасці іх насельніцтва), якія былі ўцягнуты ў міграцыйныя працэсы ўнутры беларускіх губерняў, уключаючы перасяленцаў з аднаго павета ў другі ў межах адной губерні [падлічана па: 7, 9—12, табл. 7]. Найбольшая ўдзельная вага такіх мігрантаў назіралася ў Віленскай (8,4 %; 133 179 чалавек) і Мінскай (7,4 %; 158 338 чалавек) губернях. Дастаткова заўважным быў рух наёмных работнікаў унутры беларускіх губерняў. Напрыклад, памешчыкі Мазырскага, Пінскага, Ігуменскага паветаў Мінскай губерні прыцягвалі да працы па найме батракоў са Слуцкага і Навагрудскага паветаў той жа губерні [5, с. 100]. З Рагачоўскага павета сельскагаспадарчыя рабочыя часта накіроўваліся ў суседні, Рэчыцкі, павет.

**Тэрытарыяльная мабільнасць саслоўных груп насельніцтва Беларусі.** Для розных саслоўных груп насельніцтва Беларусі была характэрна розная

ступень тэрытарыяльнай мабільнасці. На міграцыйную актыўнасць асабістых дваран, чыноўнікаў, духавенства непасрэдны ўплыў аказвала спецыфіка рэалізацыі ўрадавай палітыкі. Пагубернскія публікацыі матэрыялаў перапісу насельніцтва 1897 г. даюць няроўную магчымасць прасачыць тэрытарыяльную мабільнасць саслоўных груп насельніцтва беларускіх губерняў. Больш дэталізаваную інфармацыю прадстаўляюць выданні па Віленскай і Віцебскай губернях, дзе ў другім сшытку кожнага апублікавана табліца аб размеркаванні насельніцтва па месцы нараджэння і саслоўях. У выданнях па астатніх беларускіх губернях аналагічныя дадзеныя прадастаўлены па саслоўных групах — спадчынныя дваране, дваране асабістыя і чыноўнікі з недваран, асобы сельскага стану і асобы іншых саслоўяў.

У Віленскай губерні найбольш мабільнай групай насельніцтва аказаліся асобы духоўнага звання. Сярод апошніх налічвалася толькі 26,2 % мясцовых ураджэнцаў і 21,6 % тых, хто паходзіў з іншых паветаў роднай губерні [4, табл. 16]. Асноўная маса асоб духоўнага звання былі ўраджэнцамі іншых губерняў (52,2 %). Значную ўдзельную вагу прыезджыя мелі таксама і сярод асабістага дваранства (44,9 % з іншых губерняў і 0,5 % з замежных дзяржаў), і таксама спадчынных і асабістых ганаровых грамадзян (адпаведна 42,7 % і 0,9 %). Сярод спадчынных дваран налічвалася 69,6 % мясцовых ураджэнцаў і 11,8 % выхадцаў з іншых паветаў, разам — 81,4 % ураджэнцаў самой Віленскай губерні. Блізкімі колькаснымі паказчыкамі характарызавалася тэрытарыяльная мабільнасць купцоў. Сярод апошніх было зарэгістравана 76,6 % ураджэнцаў роднай губерні і 22,5 % — выхадцаў з іншых губерняў Расійскай імперыі.

Параўнальна памяркоўнай была міграцыйная актыўнасць мяшчан. Сярод іх налічвалася 11 % ураджэнцаў іншых губерняў і 0,2 % — замежных дзяржаў. Найбольш кансерватыўнай групай па сваёй мабільнасці было сялянства. Абсалютная большасць яго пры выбары месца жыхарства не пакідала меж роднага павета (93,0 %). Толькі 3,4 % сялян Віленскай губерні паходзілі з іншых губерняў і нават 163 (менш 0,1 %) з іх былі ўраджэнцамі замежных дзяржаў. Вызначаныя параметры тэрытарыяльнай мабільнасці прадстаўнікоў розных саслоўяў Віленскай губерні прынцыпова не адрозніваюцца ад аналагічных паказчыкаў па Віцебскай губерні.

Найбольшую ступень тэрытарыяльнай мабільнасці ў Віцебскай губерні, як і ў Віленскай, прадэманстравалі асобы духоўнага звання і ганаровыя грамадзяне. Сярод першых налічвалася 40,6 % мясцовых ураджэнцаў і 46,1 % мігрантаў унутры губерні, у ліку другіх — 43,9 % мяс-

цовых ураджэнцаў і 28,2 % выхадцаў з іншых паветаў Віцебскай губерні [8, табл. 16]. Варта звярнуць увагу на тое, што ў Віцебскай губерні была некалькі большай у параўнанні з Віленскай удзельная вага сярод прадстаўнікоў саслоўяў ураджэнцаў роднай губерні (мясцовых ураджэнцаў і ўраджэнцаў іншых паветаў губерні): сярод спадчынных дваран — 71,6 %, асабістых дваран — 66,5 %, асоб духоўнага звання — 86,7 %, ганаровых грамадзян — 72,1 %, купцоў — 76,9 %, мяшчан — 85,9 %, сялян — 94,7 %. Паводле перапісу насельніцтва 1897 г., 511,2 тыс. ураджэнцаў беларускіх губерняў пражывалі ў Расійскай імперыі па-за межамі свайго рэгіёна. Асноўная маса іх (77 %) пасялілася ў еўрапейскай частцы дзяржавы, 12,6 % — у Царстве Польскім, 6,6 % — у Сібіры і на Далёкім Усходзе, 4,8 % — на Каўказе, у Сярэдняй Азіі і Казахстане [3, с. 52].

Перасяленцы з Беларусі ў межах Расійскай імперыі накіроўваліся пераважна ў сельскія раёны. Беларусь адносілася да аднаго з нямногіх рэгіёнаў нечарназёмнай паласы Еўрапейскай Расіі, дзе пераважаў земляробчы тып каланізацыі [2, с. 205]. У той жа час за межамі беларускіх губерняў налічвалася 113 055 рабочых і прыслугі, ураджэнцаў дадзеных губерняў, што складала 22,1 % ад агульнай колькасці перасяленцаў з іх [2, с. 205]. У канцы XIX ст. беларускія губерні па ўзроўні аграрнай перанаселенасці (удзельнай вазе работнікаў адносна лішніх у сельскай гаспадарцы) пераўзыходзілі ўзровень еўрапейскай часткі Расійскай імперыі ў 1,6 раза, але значна адставалі ад сярэдніх паказчыкаў па колькасці выбраных пашпартоў, неабходных для адыходу на промыслы [4, с. 124]. Паводле даных перапісу насельніцтва 1897 г., сельскае насельніцтва беларускіх губерняў складала 9 % ад агульнай колькасці сельскіх жыхароў еўрапейскай часткі Расійскай імперыі. Удзельная вага пашпартоў, якія выбіраліся штогод у той час у беларускіх губернях, складала 5,8 % ад агульнай колькасці па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі [4, с. 124]. У пачатку XX ст. у беларускіх губернях кароткатэрміновых пашпартоў выбіралася штогод прыкладна 69 на 1000 чалавек сельскага насельніцтва, а па 50 губернях Еўрапейскай Расіі — 94 на 1000 сельскіх жыхароў [4, с. 120—121].

У айчыннай гістарыяграфіі няма дакладнага ўяўлення аб памерах эміграцыі з беларускіх губерняў за межы Расійскай імперыі. Ёсць розныя меркаванні адносна колькасці накіраваўшыхся ў працоўную эміграцыю на Амерыканскі кантынент: 500 тыс. (А. Смоліч, В. Кіпель, А. Ціхаміраў), 600 тыс. (В. Панюціч), каля 800 тыс. (В. Шчарбакоў, А. Латышонак), 1 млн (Я. Дыла); у краіны Еўропы — 150 тыс. (А. Ціхаміраў)

[3, с. 60]. Аднак практычна любая з прыведзеных лічбаў эмігрантаў з'яўляецца дастаткова блізкай да памераў колькасці мігрантаў з беларускіх губерняў у межах Расійскай імперыі. З сярэдзіны першага дзесяцігоддзя XX ст. працоўная эміграцыя ў Амерыку набывае ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях масавы характар. Праўда, у 1907—1908 гг. памеры эміграцыі некалькі скараціліся па прычыне крызісу ў ЗША і памяншэння ў гэтай сувязі попыту на рабочыя рукі [4, с. 87].

Беручы за аснову працэсы тэрытарыяльнай мабільнасці, беларускія губерні не ўяўлялі сабой ізаляванага рэгіёна, а мелі дастаткова выразныя эканамічныя сувязі з суседнімі рэгіёнамі ў Расійскай імперыі і нават з замежнымі краінамі. Міграцыйныя патокі з тэрыторыі Беларусі мелі свае рэгіянальныя асаблівасці. З Магілёўскай і Віцебскай губерняў пераважалі аграрныя міграцыі, спачатку на поўдзень і паўднёвы ўсход еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, пачынаючы з 90-х гг. XIX ст. і затым па нарастаючай — у Сібір і Далёкі Усход. У Віленскай і Гродзенскай губернях вельмі хутка адчувальнай тэндэнцыяй стаў адыход на прамысловыя прадпрыемствы Пецярбурга, Масквы, Рыгі і інш., а таксама працоўная эміграцыя за межы Расійскай імперыі.

Дынамізм сацыяльных працэсаў канца XIX — пачатку XX ст. выявіўся ва ўзросшай міграцыйнай актыўнасці насельніцтва, найперш сялянства. Нягледзячы на пэўныя напрацоўкі ў гістарыяграфіі па гісторыі міграцый асобных груп насельніцтва Беларусі, адсутнічае адзіная прасторавая карціна іх перасяленняў на тэрыторыі Расійскай імперыі і за яе межамі, а таксама аналіз этапаў і суадносных памераў міграцыйных плыняў. Механічнаму руху насельніцтва беларускіх губерняў быў характэрны хвалявідны характар. Прычыны змен яго дынамікі звязаны з цыклічнасцю эканамічнага развіцця, асаблівасцямі аграрных адносін, пашырэннем чутак, неўраджаямі і інш.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Верещагин, П. Д.* Крестьянские переселения из Белоруссии (вторая половина XIX в.) / П. Д. Верещагин. Минск : Изд-во Белорус. гос. ун-та, 1978. 144 с.

2. Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. / рэдкал.: М. С. Сташкевіч [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 1997—2002. Т. 2: Ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З. Е. Абезгауз [і інш.]; пад рэд. В. П. Панюціча. 2002. 552 с.

3. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст.: праблемы, здабыткі, перспектывы / Н. В. Анофранка [і інш.]; навук. рэд. В. В. Яноўская. Мінск : Беларус. навука, 2006. 447 с.

4. *Панютич, В. П.* Из истории формирования пролетариата Белоруссии (1861—1914 гг.) / В. П. Панютич. Минск : Наука и техника, 1969. 192 с.

5. *Панютич, В. П.* Наемный труд в сельском хозяйстве Беларуси 1861—1914 гг. / В. П. Панютич. Минск : Навука і тэхніка, 1996. 142 с.

6. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г.; под ред. Н. А. Тройницкого. Вып. IV. Виленская губерния. Тетр. 2. СПб. : Изд. центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1901. 104 с.

7. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г.; под ред. Н. А. Тройницкого. Вып. IV. Виленская губерния. Тетр. 3. СПб. : Изд. центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. XI, 179 с.

8. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г.; под ред. Н. А. Тройницкого. Вып. V. Витебская губерния. Тетр. 2. СПб. : Изд. центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1901. 110 с.

9. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г.; под ред. Н. А. Тройницкого. Вып. V. Витебская губерния. Тетр. 3. СПб. : Изд. центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. XIV, 281 с.

10. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г.; под ред. Н. А. Тройницкого. Вып. XI. Гродненская губерния. СПб. : Изд. центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. XV, 319 с.

11. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г.; под ред. Н. А. Тройницкого. Вып. XXII. Минская губерния. СПб. : Изд. центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1904. XVI, 243 с.

12. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г.; под ред. Н. А. Тройницкого. Вып. XXIII. Могилевская губерния. СПб. : Изд. центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. XV, 275 с.

13. *Сямейных, З. М.* Міграцыя беларускага сялянства ў гады сталыпінскай аграрнай рэформы (1906—1914 гг.) / З. М. Сямейных // Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. Серыя грамадскіх навук. 1982. № 4. С. 53—59.

14. *Филяков, В. Г.* Революционные связи рабочих Белоруссии и России в конце XIX — начале XX в. / В. Г. Филяков. Минск : Наука и техника, 1987. 142 с.

## РЭЗЮМЭ. SUMMARY

В статье на основе авторских подсчетов опубликованных материалов переписи населения 1897 г. в контексте ускорения процессов формирования рынка труда охарактеризованы количественные показатели переселений на территорию белорусских губерний, миграций внутри них, а также степень территориальной мобильности различных сословных групп населения.

On basis of the autors' calculating of the published materials of the popular census, which took place in 1897, in the context of acceleration of the processes of the labour market formation the article covers the quantitative indicators of migration in the Belarusian provinces, migrations inside them and the degree of territorial mobility of the different class group of population.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 31 мая 2011 г.